**Назва ТВП:** Пойма Янкі






© С. Левый

**Код:** BY045

**Геаграфічныя каардынаты:** 55° 19' N 27° 02' E

**Адміністрацыйная прыналежнасць:** Віцебская вобласць: Браслаўскі раён, Шаркаўшчынскі раён

**Плошча:** 22105 га

**Крытэрыі:** B2

**Нацыянальны прыродаахоўны статус:** частка тэрыторыі Нацыянальны парк «Браслаўскія азёры»

**Міжнародны прыродаахоўны статус:** не мае

## Агульнае апісанне:

ТВП Пойма Янкі знаходзіцца на паўночным-захадзе Беларусі. Уяўляе сабой лясны масіў з верхавымі і пераходнымі балотамі ў цэнтральнай і ўсходняй частках. Большасць лясных балот меліяравана.

Рачная сетка не развіта. Па тэрыторыіі працякая толькі некалькі малых рэк, у тым ліку дзе аднаімённых рэчкі - Янка. Азёр таксама няшмат. Возера Асвята на балоце Мох самая вялікае - плошча 0,5 км$^2$. Каля заходняй граніцы ТВП размешчана воз. Богінскае (13,2 км$^2$), на ўсходнім беразе якога, знаходзіцца сажалкавая гаспадарка па развядзенню рыбы. Гэта спрыяе гнездаванню на ТВП

рэдкай драпежнай птушкі – скапы (*Pandionhaliaetus*).

У граніцах ТВП адсутнічаюць населеныя пункты, аўтамабільных дарог вельмі мала. Такім чынам, значная часта тэрыторыі цяжкадаступная для наведвання чалавекам.

Асноўны від гаспадарчай дзейнасці – лесакарыстанне. Акрамя таго, тэрыторыя выкарыстоўваецца для палявання, рыбнай лоўлі і нарыхтоўцы грыбоў і ягад.

## Асноўныя біятопы:

лясы – 63,3%, балоты верхавыя і пераходныя – 31,7%, іншыя землі – 5%.

## Птушкі:

Арнітафауна ТВП Пойма Янкі даследавана не дастаткова і патрабуе удакладненняў.

ТВП мае мясцовае значэнне для захавання адносна вялікай гнездавой групоўкі скапы *Pandionhaliaetus.* Таксама тут адзначаны на гнездаванні і іншыя рэдкія віды птушак, дадзеныя пра іх прыведзены ў табліцы ніжэй.

## Іншыя групы жывел:

звестак няма.

## Стан рэдкіх відаў птушак:

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды (2003-2011) | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Гагач чорнаваллёвы *Gavia arctica* | мг | + | 2003-2011 | П | | |
| Чапля-бугай *Botaurus stellaris* | гн | 2-3 с | 2003-2011 | Э | | |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды (2003-2011) | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Чорны бусел *Ciconia nigra* | гн | 4-6 п | 2003-2011 | Э | | |
| Каршун чорны *Milvus migrans* | гн | > 1 п | 2011 | П | | |
| Арлан-белахвост *Haliaeetus albicilla* | гн | 1-2 п | 2003-2011 | Э | | |
| Арол-вужаед *Circaetus gallicus* | гн | 5 п | 2003-2011 | Э | | |
| Лунь палявы *Circus cyaneus* | гн | + | 2003-2011 | П | | |
| Малы арлец *Aquila pomarina* | гн | 10-12 п | 2003-2011 | Э | | |
| Скапа *Pandion haliaetus* | гн | 5-8 п | 2003-2011 | Э | | B2 |
| Сокал-пустальга *Falco tinnunculus* | гн | 3-10 п | 2003-2011 | Э | | |
| Сокал-дрымлюк *Falco columbarius* | гн | 6-8 п | 2003-2011 | Э | | |
| Сокал-кабец *Falco subbuteo* | гн | 7-10 п | 2003-2011 | Э | | |
| Драч *Crex crex* | гн | 15-20 с | 2003-2011 | Э | | |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды (2003-2011) | Крытэрый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Журавель шэры *Grus grus* | гн | 15-20 п | 2003-2011 | Э | | |
| Чайка шызая *Larus canus* | гн | 8-10 п | 2003-2011 | Э | | |
| Пугач *Bubo bubo* | гн | 1-2 с | 2003-2011 | Э | | |
| Сычык вераб'іны *Glaucidium passerinum* | гн | > 3 | 2011 | П | | |
| Кугакаўка даўгахвостая *Strix uralensis* | гн | > 2 п | 2011 | П | | |
| Кугакаўка барадатая *Strix nebulosa* | гн | > 3 | 2011 | П | | |

## Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:

не вядома.

## Пагрозы:

Пасля меліярацыйных работ самае вялікае балота ў межах ТВП Мох некалькі разоў гарэла, значна змянілась балотная расліннасць, што безумоўна адмоўна паўплывала і на мясцовых жывёл.

## Рэкамендацыі па захаванню:

Патрэбна аднаўленне гідралагічнага рэжыму балота Мох.

Перадача пад ахову мясцовым органам кіравання месц пражывання рэдкіх відаў, асабліва месц гнездавання рэдкіх драпежных птушак.

## Крыніцы інфармацыі:

Асабістыя паведамленні: Іваноўскі У.В., Левы С.В.

Отчет по НИР «Изучение территориальной локализации и состояния популяционных группировок редких и исчезающих видов птиц с целью совершенствования мер их охраны и использования в целях экотуризма в национальном парке «Браславские озера»» / рук. НИР Домбровский В.Ч., Минск, 2011.

**Складальнікі :** Левы С.В.

---

* *Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнет-рэсурсах, абавязковая спасылка на аўтараў і сайт iba.ptushki.org*